Partnership for Good Governance

# Вынікі рэгіянальных праектаў у рамках рэалізацыі “Партнёрства дзеля эфектыўнага кіравання[1]” Савет Еўропы/Еўрапейскі Саюз

## Што такое Партнёрства дзеля эфектыўнага кіравання?

У красавіку 2014 года Еўрапейскі Саюз і Савет Еўропы дамовіліся аб рэалізацыі запланаванай сумеснай дзейнасці з краінамі праэкта ЕС "Усходняе партнёрства" (Арменія, Азербайджан, Грузія, Рэспубліка Малдова, Украіна і Беларусь), каб наблізіць іх да еўрапейскіх стандартаў у галіне правоў чалавека, дэмакратыі і вяршэнства права. Праекты у рамках Партнёрства для эфектыўнага кіравання фінансуюцца ў першую чаргу ЕС, а таксама сафінансуюцца і рэалізуюцца Саветам Еўропы.

Рэгіянальныя праекты ў рамках Партнёрства дзеля эфектыўнага кіравання на раўнапраўнай аснове аб'ядноўваюць ўдзельнікаў з шасці краін і фінансуюцца ў першую чаргу ЕС, і таксама фінансуюцца і рэалізуецца Саветам Еўропы.

Усі краіны "Усходняга Партнёрства", акрамя Беларусі, з'яўляюцца дзяржавамі – членамі Савета Еўропы.

## Рэгіянальны дыялог па судовай рэформе ў краінах Усходняга партнёрства

Гэты рэгіянальны праект забяспечыў пазітыўную дынаміку ў далейшым ажыццяўленні судовай рэформы ў краінах Усходняга партнёрства, адначасова павялічвая веды прадстаўнікоў гэтых краін аб еўрапейскіх стандартах. Раўнапраўны дыялог умацаваў супрацоўніцтва і сумесную дзейнасць суддзяў, пракурораў, прадстаўнікоў міністэрств юстыцыі і адвакатскіх калегій.

Былі ўсталяваны праблемы і перадавы вопыт, а таксама былі прапанованы рэкамендацыі для нацыянальных судовых рэформ у канкрэтных галінах, такіх як: незалежнасць, этыка, дысцыплінарная адказнасць, выбар, ацэнка і недатыкальнасць суддзяў; юрыдычная дапамога; эфектыўнае размеркаванне спраў; прымяненне інфармацыйных тэхналогій у судовых сістэмах і альтэрнатыўныя

[1] Раней вядомы як праект Савета Еўропы/Еўрапейскага Саюза “Рамачнае Праграмнае Супрацоўніцтва для Арменіі, Азербайджана, Грузіі, Рэспублікі Малдова, Украіны і Беларусі”

механізмы ўрэгулявання спрэчак. Абапіраючыся на вынікі такога абмену, вопыт краін быў адлюстраваны ў дакладах рабочай групы.

► Спасылка на даведачную інфармацыю па гэтым праекце

## Ўмацаванне канстытуцыйнага правасуддзя

Праект, рэалізаваны Венецыянскай камісій, падтрымаў канстытуцыйны працэс у краінах Усходняга партнёрства праз ўмацаванне раўнапрайнай сумеснай дзейнасці канстытуцыйных судоў і заканадаўчых органаў, павялічваючы тым самым адпаведнасць нацыянальнага заканадаўства і практыкі еўрапейскім стандартам канстытуцыйнага правасуддзя. У пяці краінах быў праведзены агляд заканадаўства з шэрагам рэкамендацый Савета Еўропы, прынятых да ўвагі ў канстытуцыйным заканадаўстве:

- У Грузіі законы аб канстытуцыйным судзе і канстытуцыйным судаводстве з унесенымі папраўкамі ўступілі у сілу ў 2016 годзе, ўлічвая рэкамендацыі Венецыянскай камісіі;
- Канстытуцыйны Суд Малдовы вынес рашэнне аб канстытуцыйнасці Артыкула 27 Закона Аб Дзяржаўным Служачым, прымаючы да ўвагі большасць рэкамендацый, выкладзеных у інструкцыях прававого інстытута amicus curiae;
- Украіна ўключыла ў свае канстытуцыйнае заканадаўства многія з рэкамендацый Савета Еўропы.

Умацавая сумесную дзейнасць канстытуцыйных судоў, суддзі канстытуцыйных судоў сустрэліся на шматбаковых форумах, каб падвесці вынікі змен у канстытуцыйным правасуддзі, абменняцца рашэннямі па існуючых праблемах, якія стаяць перад канстытуцыйнымі судамі. База дадзеных CODICES гуляе важную ролю ў прасоўванні незалежнасці канстытуцыйных судоў, забяспечвая іх інструментамі для збору спасылак на замежнае і міжнароднае права ў рашэннях канстытуцыйных судоў. У 2016 годзе база дадзеных CODICES бала ўдасканалена, забяспечваючы Канстытуцыйным судам краін Усходняга партнёрства доступ да рашэнняў іншых юрысдыкцый.

► Спасылка на даведачную інфармацыю па гэтым праекце

## Паляпшэнне доступу жанчын да правасуддзя ў краінах Усходняга партнёрства

Гэты праект падтрымаў вызначэнне бар'ераў на шляху жанчын да роўнага доступу да сродкаў прававой абароны і правых гарантый, а таксама развіццё сістэмы правасуддзя з улікам гендэрнай прамлематыкі. Гэта спрыяла ўдасканаленню нацыянальных заканадаўчых, палітычных і інстытуцыйных механізмаў доступу да правасуддзя для жанчын і ўмацаванню нацыянальнага дыялогу і ведаў аб Канвенцыі Савета Еўропы аб прадухіленні і барацьбе з гвалтам у дачыненні да жанчын і хатнім гвалтам (Стамбульская Канвенцыя). Шэраг рэгіянальных і нацыянальных мерапрыемстваў аб'яднալі прадстаўнікоў міністэрстваў юстыцыі і іншых дзяржаўных органаў і зацікаўленых прадстаўнікоў грамадзянскай супольнасці, у тым ліку юрыстаў, для агляду прагрэсу і праблем з мэтай праектавання сістэм правасуддзя, якія забеспячваюць роўныя правы жанчын, іх магчымасці і ўдзел.

Былі распрацаваны нацыянальныя даследаванні, а таксама былі вызначаны і прааналізаваны канкрэтныя прававыя, працэсуальныя, сацыяльна-эканамічныя і культурныя перашкоды для роўнага доступу да правасуддзя для жанчын, у выніку чаго палепшылась якасць і даступнасць інфармацыі і аналітычных матэрыялаў. Патэнцыял суддзяў, пракурораў і іншых спецыялістаў у галіне права для

ўключэння ў сваю працу падыхода з улікам гендэрнай праблематыкі змяніўся ў лепшы бок у выніку рэалізацыі нацыянальных трэнінгаў ва ўсіх краінах-удзельніцах, з больш чым 510 удзельнікамі, у 2016-2017 гадах, з якіх крыху больш за 50% былі жанчыны. Прыхільнікі гендэрнай роўнасці ў рэгіёне краін Усходняга партнёрства былі падтрыманы ў распрацоўцы кіраўніцтва па аказанні дапамогі жанчынам, жадаючым дамагчыся справядлівасці і падаць іскавыя патрабаванні аб парушэнні правоў чалавека ў нацыянальныя суды і міжнародныя праваабарончыя пляцоўкі.

► Спасылка на даведачную інфармацыю па гэтым праекце

## Удзел грамадзян у працэсе прыняцця рашэнняў

Праект ўмацаваў рэгіянальнае супрацоўніцтва паміж грамадзянскай супольнасцю і ўладай у шасці краінах, каб палепшыць умовы для працы няўрадавых арганізацый, стварыць механізмы для іх актыўнага ўдзелу ў дэмакратычным працэсе прыняцця рашэнняў і прасоўвання культуры грамадзянскага ўдзелу. Былі праведзены шырокія даследаванні і аналіз існуючых законаў і працэдур,[2] а таксама балі атрыманы важныя практычныя веды, вылучаючыя найбольш эфектыўныя механізмы ўзаемадзеяння і ўсталявання зносін паміж уладамі і грамадзянскай супольнасцю. На рэгіянальным узроўні была створана нефармальная шматбаковая сетка, накіраваная на пошук рашэнняў для агульных або падобных праблем з удзелам і аб'яднанымі намаганнямі дзяржаўных органаў і няўрадавых арганізацый.

► Спасылка на даведачную інфармацыю па гэтым праекце

## Заахвочванне адукацыі ў галіне правоў чалавека і дэмакратычнага грамадзянства

Гэты праект падтрымаў краіны Усходняга партнёрства ў інтэграцыі адукацыі ў галіне дэмакратычнага грамадзянства і правоў чалавека (EDC/HRE) у іх нацыянальныя сістэмы адукацыі і яе далейшым развіцці, спрыяючы тым самым працэсам рэфармавання адукацыі на нацыянальным узроўні. Гэта забяспечыла накіраванасць і стала каталізатарам для дзеянняў у кожнай асобнай краіне, адначасова распаўсюджвая перадавыя практыкі і павышая еўрапейскія стандарты на рэгіянальным узроўні.

Вынікі на нацыянальным узроўні ўключаюць шэраг пазітыўных рэзультатаў, такіх як нарошчвання патэнцыяла праграм EDC/HRE для спецыялістаў у адукацыі,  стварэнне группы трэнераў, маючых магчымасць перадаваць свае веды калегам, інтэграцыя прынцыпаў EDC/HRE ў школьныя праграмы і педагагічныя практыкі.

У 2016 годзе ў Арменіі, Грузіі і Украіне былі праведзены курсы прафесійнай падрыхтоўкі для больш чым 190 педагагічных работнікаў, падкрэсліваючы навучанне для практыкуючых школьных настаўнікаў у школах у дадатак да адукацыі, атрымленай да пачатку працы. Ва Украіне праграма навучання была арыентавана на прыярытэты, вызначаныя ў Нацыянальным плане дзеянняў па правах чалавека; удзел

[2] Удзел грамадзян у працэсе прыняцця рашэнняў у краінах Усходняга партнёрства частка першая: законы і працэдуры
удзел грамадзян у працэсе прыняцця рашэнняў у краінах усходняга партнёрства частка другая:  практыка і рэалізацыя
меры па стратэгічнаму развіццю удзелу грамадзян у прыняцці рашэнняў у краінах Усходняга партнёрства

у ёй прынялі 25 рэгіянальных цэнтраў. Гэта забяспечвае патэнцыйна высокае уздзеянне, так як кожны настаўнік у краіне мае права на атрыманне паышэння кваліфікацыі кожныя пяць гадоў. У Грузіі навучанне праводзілася ў асноўнай групе нацыянальных экспертаў, якія будуць выступаць у якасці распаўсюднікаў.

На рэгіянальным узроўні было падпісана пагадненне аб супрацоўніцтве на перыяд 2017-2022 нацыянальнымі інстытутамі адукацыі Рэспублікі Беларусь і Арменіі, каб падтрымаць агульныя ключавыя меры па інтэграцыі прынцыпаў EDC/HRE ў фармальныя сістэмы адукацыі. Гэта, *сярод іншага*, ўключае ў сябе, распрацоўку інтэрнэт-партала EDC/HRE (адукацыйныя рэсурсы, інтэрнэт-курсы і прастору для супрацоўніцтва ), інтэграцыю кампетэнцый па дэмакратычнай культуре ў нацыянальныя навучальныя праграмы, стымуляванне міжкультурнай камунікацыі і развіцця ўзаемнага навучання ў галіне EDC/HRE.

► Спасылка на даведачную інфармацыю па гэтым праекце

## Садзейнічанне рэформе выпраўленчай сістэмы: ад карнага да рэабілітацыйнага падыхода

Гэты рэгіянальны праект забяспечыў Арменію, Грузію, Рэспубліку Малдова і Украіну стратэгічным кіраўніцтвам па ўкараненні палітыкі па скарачэнні перапоўненасці турмаў. Меры, даказаўшыя сваю эфектыўнасць ў адной краіне, могуць быць крыніцай натхнення для іншых. Праект умацаваў рэгіянальнае супрацоўніцтва, стварыўшы форум для абмену вопытам сярод высокапастаўленых чыноўнікаў і практыкаў з чатырох краін – удзельніц Усходняга партнёрства аб тым, як лепш змагацца з перапоўненасцю турмаў. Той факт, што некаторыя краіны ўжо прызналі – і ў нейкай ступені мелі справу з праблемай перапоўненасці турмаў, павялічваецца імкненне да рэгіянальнага супрацоўніцтва і абмена вопытам у тых краінах, дзе праблема перапоўненасці яшчэ не атрымала належнай увагі. На аснове рэгулярных міжнародных і рэгіянальных абменаў вопытам былі падрыхтаваны даклады з канкрэтнымі прапановамі ў дачыненні да мер па барацьбе з перапоўненасцю турмаў. Гэты праект рэалізоўваўся з жніўня 2015 года па чэрвень 2016 года.

► Спасылка на даведачную інфармацыю па гэтым праекце

## Крымінальна-прававыя меры процідзеяння наркатычнай залежнасці ў турмах

Гэты рэгіянальны праект Pompidou group (групы Пампіду) – Групы супрацоўніцтва па барацьбе з ужываннем наркотыкаў і кантрабандай наркотыкаў заснаваў рэгіянальнае супрацоўніцтва па перадавым мерам у дачыненні да перапоўненасці турмаў, альтэрнатывы турэмнага зняволення і рэабілітацыі наркаманаў у Арменіі, Грузіі, Рэспублікі Малдова і Украіне. Гэты праект падтрымаў палітычных дзеячаў Грузіі ў распрацоўцы нацыянальнай палітыкі ў дачыненні да перапоўненасці турмаў і альтэрнатыў пакарання ў адпаведнасць з еўрапейскімі стандартамі. Ва Украіне праект дапамог адміністрацыі турмаў палепшыць тэрапеўтычныя сродкі, такія як сямейная тэрапія і метадалогія ацэнкі рызык у двух турмах для непаўналетніх. У Арменіі  прафесійны абмен вопытам з міжнароднымі экспертамі прывёў да павышэння якасці паслуг зніжэння шкоды, праграмы лячэння нарказалежнасці і прафілактыкі ВІЧ у турмах. Акрамя таго, праект дазволіў умацаваць і дыверсіфікаваць лячэнне наркаманіі і паслугі рэабілітацыі ў турмах у Рэспубліке Малдова. Турэмны персанал і сацыяльныя работнікі былі навучаны таму, як усталяваць і весці Тэрапеўтычную супольнасць на базе турмы. Навучанне суправаджалася

рэканструкцыі турэмнай камеры, якая цяпер месціць першую Тэрапеўтычную Суппльнасць у турме ў Рэспубліцы Малдова.

► Спасылка на даведачную інфармацыю па гэтым праекце

## Барацьба з карупцыяй, адмываннем грошай, і садзейнічанне эфектыунаму кіраванню

Гэты праект падтрымаў краіны Усходняга партнёрства ва ўмацаванні іх інстытуцыйнага патэнцыялу для барацьбы з карупцыяй і адмываннем грошай. Праект умацаваў рэгіянальны абмен передавым вопытам і міжнароднае супрацоўніцтва з удзелам усіх шасці краін Усходняга партнёрства. Праект аб'ядноўвае рэгіянальную і эксперыментальную дзейнасць краін, дапаўняючы праекты краін, якія ўваходзяць у склад Партнёрства дзеля эфектыўнага кіравання. На рэгіянальным узроўні Савет Еўропы па тэхнічнай дапамоге спрыяў паляпшэнню практыкі прадухілення карупцыі на аснове рэкамендацый для краін. Ацэнка карупцыйных рызык у сферы аховы здароўя вызначыла карупцыйня рызыкі і ўразлівасці ў сектары аховы здароўя, а таксама парэкамендавала меры па ўдасканаленні кантролю за гэтымі рызыкамі ў пяці краінах.

Характэрныя для кожнай краіны меркаванні экспертаў і дапамога, закладзеныя у бесперапынныя працэсы нацыянальнага рэфармавання:

- Улады Рэспублікі Малдова атрымалі парады па праекце крымінальнага заканадаўства ў мэтах узмацнення рэжыму пакарання за карупцыйныя правапарушэнні;
- Азербайджан спрыяў кіраванню рызыкамі на дзяржаўнай службе з паследуючай падтрымкай праекта;
- Беларусь атрымае пользу ад вопыту Савета Еўропы па ўмацаванні сумленнасці і непадкупнасці ў сферы адукацыі з дапамогай ацэнкі рызык эфектыўнаму кіраванню.

## Кіберзлачыннасць: праекты па рэгіянальнаму/міжнароднаму і дзяржаўнаму/прыватнаму супрацоўніцтву

Па пытанні міжнароднага супрацоўніцтва Савет Еўропы патрымаў улады узаемнай юрыдычнай дапамогі і супрацоўнікаў адзінай даведачнай службы 24/7 для далейшага развіцця навыкаў для міжнароднага і рэгіянальнага супрацоўніцтва. Каманда праекта правяла навучанне як супрацоўнікаў узаемнай юрыдычнай дапамогі, так і супрацоўнікаў адзінай даведчай службы 24/7 ва ўсіх краінах Усходняга партнёрства, а таксама аказала дадатковую падтрымку для забеспячэння выканання канкрэтных рэкамендацый па краінам і далей удасканаліла онлайн-інструменты для міжнароднага супрацоўніцтва. Гэта дапамагло палепшыць абмен інфармацыяй паміж мэтавымі краінамі па кіберзлачыннасці і электронным доказам, а таксама павысіць эфектыўнасць ўзаемадзеяння з міжнароднымі пастаўшчыкамі паслуг.

У мэтах умацавання дзяржаўнага/прыватнга супрацоўніцтва паміж дзяржавамі ў адпаведнасці з Канвенцыяй Савета Еўропы аб кіберзлачыннасці, Савет Еўропы далучыў краіны Усходняга партнёрства

да нацыянальнага і рэгіянальнага дыялогу паміж праваахоўнымі органамі і інтэрнэт-правайдэрамі (у тым ліку шматнацыянальны кампаніі), якія накіраваны на паляпшэнне доступу да звестак і доказаў у крымінальных расследаваннях. Гэты працэс быў падтрыманы living рознымі рэгіянальнымі і міжнароднымі даследаваннямі на розныя тэмы дзяржаўна-прыватнага супрацоўніцтва. У выніку пяць з шасці краін Усходняга партнёрства пераглядаюць свае крымінальна-працэсуальнага заканадаўства, дзве краіны разглядаюць магчымасць прыняцця новых або пашырэння існуючых пагадненняў аб супрацоўніцтве. Праз першае рэгіянальнае тэхнічнае мерапрыемства ў рэальным часе, удзельнікі праекта набылі навыкі, неабходныя для міжведамаснага ўзаемадзеяння для працы з камп'ютэрнымі інцыдэнтамі, расследавання кіберзлачынстваў і абмена фінансавай інфармацыяй.

- Спасылка на даведчаю інфармацыю аб кіберзлачыннасці ў краінах Усходняга партнёрства II: рэгіянальнае і міжнароднае супрацоўніцтва
- спасылка на даведчаю інфармцыю аб кіберзлачыннасці ў краінах Усходняга партёрства III: дзяржаўнае/прыватнае супрацоўніцтва

## Павышэнне павагі да абароны правоў чалавека ў інтэрнэце

Гэта быў першы праект супрацоўніцтва ў сферы кіравання інтэрнэтам, ён стаў сведкай актыўнага ўдзелу нацыянальных зацікаўленых бакоў краін Усходняга партнёрства ў рэгіянальных і глабальных дыскусіях па пытаннях кіравання інтэрнэтам. Мерапрыемствы ў рамках рэгіянальнага аспекту таксама спрыялі стварэнню форума для шматбаковага дыялогу ў краінах-удздельніцах і ўзмацнілі яго, а таксама ўнеслі пытанне інтэрнэта і правоў чалавека ў праграму нацыянальнага вышэйшага кіраўніцтва. Праект надаў Савету Еўропы магчымасць  ахапіць шырокі круг нацыянальных зацікаўленых бакоў у краінах Усходняга партнёрства і ўсталяваць рэгіянальны абмен вопытам.

- Нацыянальныя зацікаўленыя бакі з шасці краін Усходняга партнёрства ўдзельнічалі ў дыялогу і дыскусіі па пытанням палітыкі ў сферы глабальнага і рэгіянальнага кіравання інтэрнэтам;
- Усталяваны і ўмацаваны шматбаковы дыялог у Грузіі, Рэспубліцы Малдова і Украіне;
- Павышэнне ўзроўню ведаў і зацікаўленасці пастаўшчыкоў паслуг інтэрнэту кіраўніцтвамі Савета Еўропы па правах чалавека ў Рэспубліцы Малдова і Грузіі;
- Пашырэнне ведаў сярод дзяржаўных і недзяржаўных суб'ектаў па еўрапейскім стандартам у галіне свабоды выказвання меркаванняў у інтэрнэце, канфідэнцыяльнасці ў інтэрнэце і г. д. з дапамогай мэтавых мерапрыемстваў, рэгіянальных абменаў вопытам і прасоўваючых матэрыялаў у краінах Усходняга партнёрства;
- Павелічэнне дасведчанасці грамадскасці па пытаннях прадухілення і процідзеяння парушэнням правоў чалавека ў інтэрнэце ў краінах Усходняга партнёрства праз перадачу і распаўсюджванне стандартаў Савета Еўропы;
- Рэкамендацыі экспертаў для нацыянальных органаў па ўдасканаленні нацыянальнай палітыкі і заканадаўства ў адпаведнасці з прынятымі стандартамі Савета Еўропы па пытанні інтэрнэта і правоў чалавека ў Рэспубліцы Малдова і Грузіі.

## Развіццё і ўмацаванне нацыянальных сістэм  абароны дадзеных

Праект прадаставіў рэсурсы для таго, каб сфакусаваць больш пільную ўвагу на патрэбах і патрабаваннях кожнай краіны Усходняга партнёрства і забяспечыць кантроль за ўжо праведзенай

Саветам Еўропы працай, а таксама развіваць папярэднія дасягнененнені. Прагрэс і дасягненні некаторых з краін Усходняга партнёрства, якія маюць больш прасунутыя сістэмы абароны дадзеных (Украіна і Грузія, напрыклад), былі выкарыстаны ў якасці мадэлі і перадавой практыкі, на аснове якіх іншыя краіны Усходняга партнёрства маглі б павучыцца. Мелі месца плённыя абмены паміж шасцю краінамі Усходняга партнёрства, праведзеныя ў зручным фармаце, что вядзе да ўсталявання больш цесных сувязяў і супрацоўніцтва паміж краінамі.

- Умацаваўся патэнцыял Агенцтва Грузіі па абароне дадзеных. Аснаваючыся на вопыце, атрыманым у праекце, было перагледзена заканадаўства Грузіі па абароне дадзеных у адпаведнасці са стандартамі Савета Еўропы;
- Умацаваўся патэнцыял Агенцтва Рэспублiцы Малдова па абароне дадзеных. Асноўваючыся на вопыце, атрыманым у праекце, быў падрыхтаваны Малдаўскі праект па заканадаўству ў галіне абароны дадзеных;
- Праект прадставіў рэкамендацыі экспертаў па заканадаўству, а таксама быў падрыхтаваны праект Стратэгіі развіцця армянскага Нацыянальнага агенцтва па абароне дадзеных на 2017-2021 гады;
- Быў распрацаваны і распаўсюджаны вучэбны дапаможнік для органаў па абароне дадзеных у краінах Усходняга партнёрства;
- Былі распрацаваны і распаўсюджаны рэкамендацыі па абароне прыватнага жыцця ў СМІ;
- Уладам Беларусі была аказана падтрымка ў распрацоўцы канцэпцыі нацыянальнага заканадаўства аб абароне дадзеных і стварэнні органа па абароне дадзеных. На аснове экспертнай падтрымцы Савета Еўропы беларускімі ўладамі будзе падрыхтавана нацыянальнае законадаўства.

## Садзейнічанне прафесійнай і адказнай журналістыкі ў рамках рэгіянальнай сеткі органаў самарэгулявання

Гэты рэгіянальны праект быў распрацаваны з мэтай далейшага ўмацавання самарэгулявання, павышэння журналісцкай этыкі і прафесійных стандартаў, а таксама ўмацавання рэгіянальных абменаў вопытам, накіраваных на саветы прэсы (самаругуляваныя арганізацыі) усіх шасці краін Усходняга партнёрства.

- Ўмацаванне інстытуцыйнага патэнцыялу органаў самарэгулявання ў краінах Усходняга партнёрства праз падтрымку арганізацыі сустрэч сеткі рэгіянальных органаў самарэгулявання, якія адбываюцца два разы ў год;
- Рэгіянальныя абмены вопытам дазволілі членам сеткі пашырыць свае веды аб апошніх зменах у еўрапейскім сектары самарэгулявання і адпаведных стандартах і перадавых практык Савета Еўропы;
- Ўзмацнененне патэнцыялу членаў сеткі органаў самарэгулявання краін Усходняга партнёрства з дапамогай стварэння міжнароднага кансультатыўнага органа/камісіі, якім даручана разглядаць міжнародныя скаргі ад шырокай грамадскасці з краін Усходняга партнёрства пра меркавыныя неэтычных паводзіны журналістаў.

- Спасылка на даведачную інфармацыю па гэтым праекце

## Рэфармаванне выбарчага заканадаўства і практыкі, а таксама развіццё рэгіянальнага супрацоўніцтва ў выбарчай сферы

За кошт рэгіянальных і краінавых ініцыятыў быў узмоцнены патэнцыял цэнтральных выбарчых камісій (ЦВК) краін Усходняга партнёрства, каб арганізовываць сапраўдныя і вартыя даверу выбары. Рэгіянальныя абмены вопытам далі членам ЦВК магчымасць палепшыць свае веды аб фундаментальных аспектах выбарчага працэсу. Для гэтага Венецыянская камісія арганізавала дзве Еўрапейскай Канферэнцыі па кіраванню выбарчымі органамі: як забяспечыць нейтралітэт, бесстароннасць і празрыстасць выбараў, а таксама па кіраванні аператыўнымі выбарчымі органамі для правядзення дэмакратычных выбараў.

У мэтах умацавання гендэрнага ўдзелу ў выбарчых працэсах Камісія таксама арганізавала шматбаковую канферэнцыю па гендэрнай роўнасці з удзелам цэнтральных выбарчых камісій з пяці краін-партнёраў. Прадстаўнікі цэнтральных выбарчых камісій Арменіі, Азербайджана, Грузіі, Рэспублікі Малдова і Украіны, а таксама парламентарыі і прадстаўнікі грамадзянскай супольнасці палепшылі свае веды ў вобласці (бясплатных) СМІ і выбараў у рамках абмена меркаваннямі ў ходзе канферэнцыі па свабодзе СМІ як асновы для правядзення дэмакратычных выбараў, сумесна арганізаванай Парламенцкай Асамблеяй Савета Еўропы і Венецыянскай камісіяй.

Рэгіянальныя трэнінгі для ўнутраных назіральнікаў і дзьва даведніка "Выкарыстанне міжнародных выбарчых стандартаў" і "Справаздача аб выбарах", даступная на англійскай і мясцовых мовах Украіны, Рэспублікі Малдова, Грузіі і Арменіі, шырока распаўсюджаныя сярод больш чым за 1000 мясцовых назіральнікаў, спрыялі прафесіяналізацыі ўнутранага назірання за выбарамі на аснове еўрапейскіх стандартаў у краінах Усходняга Партнёрства. Акрамя таго, у цяперашні час электронны навучальны курс, заснаваны на дапаможніках Савета Еўропы, выкарыстоўваецца не толькі назіральнікамі, але і арганізацыямі грамадзянскай супольнасці, якія працуюць на выбарах, і людзьмі, якія жадаюць удасканальць свае веды аб выбарах (ліпень-жнівень 2017: 105 карыстальнікаў, 29 сертыфікатаў).

"Рэгіянальнае даследаванне па пытанні аб палітычным прадстаўніцтве жанчын у краінах Усходняга партнёрства" было апублікавана і распаўсюджана сярод 1 700 удзельнікаў выбарчага працэсу ў краінах Усходняга партнёрства. Яно выкарыстоўваецца ў якасці асновы для праектаў, накіраваных на павышэнне палітычнага ўдзелу жанчын, і ў якасці інфарматыўнай дапамогі для публічнага абмеркавання, выяўлення ключавых бар'ераў, якія перашкаджаюць ўдзелу жанчын у палітычным жыцці і наданні ім кіраўнічых магчымасцей, а таксама вывучэння станоўчага вопыту і прыкладаў. Даследаванне даступна на армянскай, азербайджанскай, англійскай, грузінскай, румынскай і ўкраінскай мовах

На працягу чатырох рэгіянальных канферэнцый каля 400 удзельнікаў абмяняліся вынятымі ўрокамі і перадавымі практыкамі і сфармулявалі рэкамендацыі па далейшаму ўдасканаленню гендэрнай роўнасці ў палітыцы, рэалізацыі рэкамендацый міжнародных місій па назіранні за выбарамі, а таксама празрыстасці і кантролю грошай у палітыцы.

► Спасылка на даведачную інфармацыю па гэтым праекце

## Ўмацаванне інстытуцыйных асноў мясцовага самакіравання

Гэты праект падтрымаў краіны Усходняга партнёрства ў наданні мясцовым дзяржаўным адміністратыўным органам большай празрыстасці, эфектыўнасці і агульнадаступнасці ў адпаведнасці з прынцыпамі Еўрапейскай хартыі мясцовага самакіравання. У працэсе прасоўвання высокіх этычных стандартаў 60 мэраў з Арменіі, Азербайджана, Грузіі, Рэспублікі Малдова і Украіны абмяняліся з калегамі практычнымі інструментамі і метадамі распрацоўкі палітыкі, арыентаванай на інтарэсы

грамадзян. Была аказана падтрымка дванаццаці муніцыпалітэтам з гэтых краін ў рэалізацыі мясцовых ініцыятыў па этычным кіраванні і празрыстасці, што прывядзе да паляпшэння якасці мясцовай дэмакратыі і абслугоўванні грамадзян.

Акрамя таго, была заснавана супольнасць  практыкуючых – сетка з удзелам экспертаў па пытаннях эфектыўнага кіравання і грамадзянскага ўдзелу, а таксама прадстаўнікоў асацыяцый мясцовых і рэгіянальных улад. Сустракаючыся на рэгулярная аснове, сетка стварае зручную платформу для абмену думкамі па праблемах мясцовай дэмакратыі, у прыватнасці ў кантэксце тэрытарыяльных рэформаў, для падтрымкі нацыянальных асацыяцый мясцовых уладаў і іх укладу ва ўдасканаленне заканадаўчай базы. Вынікі ўключаюць у сябе падпісанне мемарандума аб узаемаразуменні паміж нацыянальнымі асацыяцыямі мясцовых і рэгіянальных уладаў Грузіі, Рэспублікі Малдова і Украіны у мэтах пашырэння рэгіянальнага супрацоўніцтва.

Для таго каб дапамагчы палепшыць прадастаўленне паслуг для мясцовых суполак праект таксама спрыяў развіццю міжмуніцыпальнага супрацоўніцтва і параўнальнага аналізу мясцовых фінансавых паказчыкаў, якія з'яўляюцца практычнымі інструментамі ва ўмацаванні патэнцыялу асобных краін для іх мясцовага развіцця. У адрас нацыянальных уладаў былі накіраваны канкрэтныя рэкамендацыі; на муніцыпальным узроўні праект аказаў фінансавую падтрымку пяці мясцовым ініцыятывам па забеспячэнню міжмуніцыпальнага супрацоўніцтва, якое дасць магчымасць павысіць якасць паслуг водазабеспячэння і каналізацыі, утылізацыі адходаў, рамонту дарог і турызму. Праект падтрымаў 50 муніцыпалітэтаў ў Арменіі, Грузіі і Рэспубліке Малдова для паляпшэння фінансавага кіравання мясцовай адміністрацыі. Для забеспячэння далейшага выкарыстання інавацыйных інструментаў для параўнальнага аналізу мясцовых фінансавых рэзультатаў, праект падтрымаў распрацоўку спецыяльнага праграмнага забеспячэння і вылучыў парталы ў партнёрстве з нацыянальнымі адміністрацыямі. Іншыя прыклады ўключаюць дапамогу, якая была аказана аўтаномным установам Гагаузіі для ўдасканалення працэсу падрыхтоўкі заканадаўчых ініцыятыў і прававых заключэнняў; супрацоўніцтва па пытаннях кіраўніцтва, планавання і справаздачнасці з рэгіянальнымі і мясцовымі органамі ўлады Беларусі.

► Спасылка на даведачную інфармацыю па гэтым праекце

**Больш падрабязная інфармацыя**: http://pjp-eu.coe.int/en/web/eap-pcf/home

**Кантактная інфармацыя:** Нікола Хаусон, Супрацоўнік па пытаннях камунікацыі, +33 388 41 22 39
**Верасень 2017**